# Са святам, мілыя сяброўкі!




# Гродзенскі Універсітэт

ГАЗЕТА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Выдаецца з 1986 года • № 2 (263) • 1 сакавіка 1999 года, панядзелак

Выходзіць адзін раз на месяц • Распаўсюджваецца бясплатна


## АД УСЯГО СЭРЦА

Віншуем нашых слаўных, мілых жанчын і дзяўчат з Міжнародным жаночым днём.

У наш нялёгкі час Вы, нашы непаўторныя, дарагія, усклалі на свае кволыя плечы цяжар клопатаў аб будучых пакаленнях, аб жыцці, аб дабрабыце і ў сям'і, і ў грамадстве. Немагчыма ўявіць наша жыццё без жанчын. Менавіта Вы, дарагія жанчыны-маці, жанчыны-сяброўкі, сёстры, дачушкі, робіце прыгожым гэты свет. Вашы цеплыня і дабрыня дапамагаюць у нялёгкія часіны выпрабаванняў, а радасць робіцца ўдвая ярчэйшай побач з Вамі. Шчасця, здароўя Вам, слаўныя, мілыя, непаўторныя! Поспехаў у працы, радасці, кахання, дабрабыту!

**Рэктарат, прафкам, Савет ветэранаў.**

## 8 МАРТА

**Андрей ГАЙСА, студент 2 курса физико-технического факультета**

С этим праздником весенним
Поздравляю милых дам
И сердечно пожелаю
То, что друг желал бы вам:
Чтобы жизнь всегда ласкала,
Как любимое дитя,
Сердце горести не знало,
Чтобы жили вы шутя.
И удача пусть повсюду
Ходит прямо по пятам.
Будьте счастливы, любимы,
Долгих лет желаю вам.
Да, и главное - здоровья
Мне хотелось пожелать.
Дома, как и на работе,
Красотой своей сиять.

## Святлана Крук — віцэ-міс конкурса прыгажосці «Міс Садружнасці-99»



**Студэнтка III курса матэматычнага факультэта Святлана Крук, міс Беларусь, у першым міжнародным конкурсе прыгажосці «Міс Садружнасць-99», які праходзіў у Маскве, выйшла ў фінал і заваявала тытул Віцэ-міс конкурса прыгажосці «Міс Садружнасць-99». Усяго ў конкурсе прымалі ўдзел 36 прадстаўніц з 12 дзяржаў СНД - па 3 ўдзельніцы ад кожнай краіны. А ў фінал выйшлі толькі пяць дзяўчат, якія прадстаўлялі Арменію, Беларусь, Малдову, Таджыкістан, Украіну. «Міс Садружнасць-99» стала Аруцюнян Гуар (Арменія). А яшчэ чатыры фіналісткі, у тым ліку і наша Святлана - удастоены звання Віцэ-міс Садружнасці-99. Інтэрв'ю з С. Крук — на 3-й старонцы.**

## ЦИТАТА НОМЕРА:

***«Ожидание радости тоже есть радость».***

***Г. Лессинг.***

## ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

**Нагадваем, калі і каго можна павіншаваць з юбілеем.**

2 сакавіка - **Наталлю Кліменцьеўну ШОСТКА** - лабаранта І катэгорыі кафедры батанікі і заалогіі.

5 сакавіка - **Ігара Вячаслававіча ЯГОРАВА** - дацэнта кафедры рускай і замежнай літаратуры.

8 сакавіка - **Аляксандра Васільевіча БУЯКА** - загадчыка кафедры батанікі і заалогіі.

8 сакавіка - **Марыю Сямёнаўну БУДЗЬКО** - гардэробшчыцу навучальнага корпуса N 2.

8 сакавіка - **Рамуальда Юльянавіча ПАСЮКА** - дворніка навучальнага корпуса N 2.

11 сакавіка - **Валянціну Сцяпанаўну БАГАСЛОЎСКУЮ** - старшага выкладчыка кафедры ўзроставай і педагагічнай псіхалогіі.

11 сакавіка - **Людмілу Сяргееўну ДУДЗІНСКУЮ** - вартаўніка.

12 сакавіка - **Соф'ю Мікалаеўну КРЫВЕЦ** - дзяжурную інтэрната N 4.

13 сакавіка - **Мікалая Мікалаевіча ІВАНОВА** - дацэнта кафедры прыкладной матэматыкі.

14 сакавіка - **Уладзіславу Іосіфаўну МАЛЫШКА** - вартаўніка навучальнага корпуса N 4.

16 сакавіка - **Марыю Іванаўну КАРАЛЁВУ** - бухгалтара І катэгорыі.

19 сакавіка - **Алену Іосіфаўну ЦЫГАН** - лабаранта кафедры дзяржаўнага, працоўнага і сельскагаспадарчага права.

21 сакавіка - **Мікалая Іванавіча ЗДАСЮКА** - дацэнта кафедры адміністрацыйнага і міжнароднага права.

27 сакавіка - **Дзмітрыя Якаўлевіча СМАЛЯ** - дацэнта кафедры культуралогіі.

27 сакавіка - **Вікенція Вікенцьевіча ТАРКОЎСКАГА** - дацэнта кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі.

28 сакавіка - **Станіславу Аляксандраўну ВАСКАБОЙНІКАВУ** - мыйшчыцу пасуды сталовай.

29 сакавіка - **Аляксандра Іванавіча КАПЫТКУ** - дацэнта кафедры філасофіі.

*Афіцыйна*

## АБМЕРКАВАНА РЭКТАРАТАМ

На адным з пасяджэнняў рэктарата ў лютым было абмеркавана пытанне аб плане рамонтна-будаўнічых работ на 1999 год. З інфармацыяй выступіў прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце К.В.Ярмак. Ён паведаміў аб выкананні аб'ёмаў рамонтна-будаўнічых работ у мінулым годзе. Асвоены значны аб'ём сродкаў. Зроблены рамонт у галоўным корпусе, у месцах агульнага карыстання, у корпусе па вул. Захарава. На гэты год складзены план бягучага і капітальнага рамонту памяшканняў універсітэта і праектна-сметная дакументацыя. Аб'ём работы вялікі, проста немагчыма тут пералічыць усе найменні работ.

Гэта інфармацыя выклікала бурнае абмеркаванне. Выступаўшыя адзначалі як станоўчыя бакі - палепшыўся агульны выгляд памяшканняў - так і мінусы: захапленне знешнімі эфектамі часам наносіць страты рамонту аўдыторый, дошак, сталоў, асвятлення, што так неабходна для навучальнага працэсу. Былі выказаны прапановы аб удзеле студэнтаў у рамонце мэблі.

Было абмеркавана таксама палажэнне аб заахвочванні і льготах у аплаце за навучанне для студэнтаў, якія навучаюцца на дагаворнай аснове. З інфармацыяй выступіў намеснік дэкана сектара платнай адукацыі А.Л. Белавусаў.

Рэктар універсітэта прафесар С.А. Маскевіч падвёў вынікі пасяджэння, падзяліўся ўражаннямі аб нядаўняй камандзіроўцы ў сталіцу.

## ГРОДЗЕНСКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ УНІВЕРСІТЭТУ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ -

*ПОСТАЦІ ВНУ*

# ПАЭЗІЯ І ПРОЗА Ў ТВОРЧАСЦІ ПРАФЕСАРА МАРТЫНАВА

**Віктар ТАРАНЦЕЙ, прафесар**



І.П. Мартынаў (нар. 12.08.1938 г.) - адзін са сталых загадчыкаў кафедр нашай вну. У 1977 годзе ён прыняў кафедру геаметрыі і методыкі выкладання матэматыкі, потым - кафедру матэматычнага аналізу (з 1980 г.), якой і кіруе да цяперашняга часу.

У 1956 годзе Іван Мартынаў паступіў на матэматычны факультэт Гродзенскага педагагічнага інстытута. Абітурыент набраў 33 балы па сямі прадметах уступных экзаменаў (матэматыка вусна і пісьмова, сачыненне, дыктант, фізіка, хімія, замежная мова). У першыя дні з радасцю даведаўся, што навучанне ў педінстытуце бясплатнае. Бо ў апошніх класах школы маці плаціла за вучобу па 150 тагачасных рублёў. Вучыўся старанна і рупліва. Займаўся навуковай работай у дацэнта Н.Д. Беспамятных, наведваў навуковы і танцавальны гурткі.

Матэматыка студэнта захапіла так, што ў ёй ён стаў бачыць усё сваё існаванне, паэзію і прозу жыцця. Выкладчыкам вельмі падабалася яго глыбокае пранікненне ў праблему, нестандартныя падыходы да засваення матэрыялу.

Пасля заканчэння вну і службы ў арміі І.П. Мартынаў працуе настаўнікам Індурскай школы, дырэктарам Індурскай школы рабочай моладзі. Затым вучыцца ў аспірантуры, абараняе кандыдацкую дысертацыю (1977 г.), доктарскую (1990 г.), атрымлівае званне прафесара (1990 г.).

Універсітэцкі прафесар І.П. Мартынаў доўгія гады незалежна ад выкладання ў Гродзенскім педагагічным інстытуце працаваў настаўнікам у школе N 1 г. Гродна. І ў вну першы ўрок і першую лекцыю ён пачынае паэтычным радком: «Каб пазнаць гармонію сусвету, вывучайце матэматыку. Толькі ў матэматыцы гармонія ёсць!» Прафесару заўсёды ўдаецца выклікаць устойлівы інтарэс і зацікаўленасць вучняў і студэнтаў, для якіх матэматыка становіцца не толькі прадметам, але і прафесіяй. Напрыклад, у 1988 годзе дацэнт І.П. Мартынаў правёў адкрытыя урокі ў школе для ўдзельнікаў Усесаюзнай канферэнцыі. Ён так захапіў вучняў і выкладчыкаў вну з розных куткоў былога Саюза, што адзін з іх у захапленні стаў, як вучань, шматкратна падымаць руку для адказу.

Матэматык І.П. Мартынаў ганарыцца многімі сваімі вучнямі, аспірантамі і спашукальнікамі. Але найбольш святлее яго твар, калі гаворка заходзіць аб Станіславе Сабалеўскім. Два гады Станіслаў наведваў у школе N 1 клас Мартынава, за чатыры гады замест пяці датэрмінова закончыў універсітэт, цяпер ён аспірант першага курса. У Брэсце ён уразіў масцітых вучоных з замежжа, калі глыбокія пытанні па сутнасці даследавання задаваў на добрай англійскай мове.

І.П. Мартынаў друкуе артыкулы ў часопісах «Даклады Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь», «Дыферэнцыяльныя ўраўненні» і ў іншых прэстыжных выданнях. Шмат увагі І.П. Мартынаў у розныя гады надаваў развіццю студэнцкай навукі, узначальваў савет студэнцкага навуковага таварыства, з'яўляўся старшынёй журы абласных алімпіяд. У 1998 годзе І.П. Мартынаў за работу з таленавітай моладзю атрымаў прэзідэнцкую прэмію.

Калегі адзначаюць выдатныя якасці, якія належаць асобе І.П. Мартынава: «Выдатны сябар і сем'янін, з вялікай гатоўнасцю аказвае дапамогу выкладчыкам кафедры, здольны і эрудыраваны выкладчык матэматыкі». Асабліва падабаецца ацэнка І.П. Мартынава яго настаўнікам Н.Д. Беспамятных: «І.П. Мартынаў - гэта чалавек абавязку і бездакорных паводзін!».

З 1994 года І.П.Мартынаў імкліва пераадольвае ступені службовай лесвіцы ва універсітэце - дэкан, прафесар, першы прарэктар, прызначаецца старшынёй спецыялізаванага савета па абароне кандыдацкіх дысертацый па дыферэнцыяльных ураўненнях.

У І.П. Мартынава шмат творчых задумак і ідэй.

# ...на, сакавік, маладосць...



На здымку: студэнтка 3 курса факультэта гісторыі і культуры Вольга КАРПУК.

Вольга Карпук родам з Зэльвенскага раёна. Сярэднюю школу ў вёсцы Караліно скончыла з залатым медалём, па выніках сумоўя паступіла на факультэт гісторыі і культуры. Гісторыя яшчэ ў школе была любімым прадметам. А таму і ва універсітэце Вольга вучыцца ў асноўным на «выдатна». Захапляецца работай у краязнаўчым гуртку, узнагароджана ганаровай граматай за навуковую работу. З'яўляецца старастай групы.

Таццяна Шубзда - залатая медалістка, выпускніца фізіка-тэхнічнага класа школы-ліцэя N 19. Па яе словах, было б нелагічна, калі б яна паступіла не на фізіка-тэхнічны, а на іншы факультэт. Таня не была абітурыенткай. Яна залічана ва універсітэт па выніках выпускных экзаменаў у ліцэі, якія сумяшчаліся з уступнымі.

Чым цікава гэтая студэнтка? Тым, што яна не толькі выдатніца вучобы, але і асоба. Аптымістка. Любіць жыццё. Ёсць і захапленне - выкананне аўтарскай песні.



На здымку: студэнтка 4 курса фізіка-тэхнічнага факультэта Таццяна ШУБЗДА.

# СВЯТЛАНА КРУК — ВІЦЭ-МІС
## конкурса прыгажосці «Міс Садружнасці-99»

**- Святлана, з чаго пачалася твая кар'ера топ-мадэлі?**

- Я нават ні аб чым такім не марыла. Паступіла на матэматычны факультэт, бо вучылася ў матэматычным класе. Мама, Таццяна Уладзіміраўна, выкладчык матэматыкі ў ПТВ-141, бацька - Уладзімір Уладзіміравіч, працуе інжынерам-забеспячэнцам у абласной друкарні. Ніхто не думаў, што я - будучая мадэль. На першым курсе запісалася ў школу ЮНІарт. Сталі нас запрашаць на розныя паказы. А потым на пяць месяцаў паехала ў нацыянальную школу прыгажосці пры Прэзідэнце, нас рыхтавалі да конкурса «Міс Беларусь». Вядома ж, гэтая падрыхтоўка многае дала: як прайсці, як усміхнуцца, куды дзець рукі - для навічка гэта ўсё складана. Хто прайшоў падрыхтоўку - у тых і пластыка, і артыстычнасць, і ўменне трымацца на сцэне. Дык вось, я не збіралася нават стаць міс Беларусь, хаця была, прызнаюся, упэўнена, што ў першую пяцёрку траплю. А калі падвялі вынікі, і я заняла першае месца, вядома ж, адчувала сябе шчаслівай. Работа над сабой не прайшла дарэмна.

**- А што такое работа над сабой?**

- О, для мадэлі гэта ўсё. Я цяпер, калі праглядаю відэакасеты з першымі паказамі, бачу, як гэта было непрафесійна, неяк ненатуральна. А з кожным новым выступленнем шліфавалася пластыка, уменне трымацца вольна, артыстычна. За ўсім гэтым - работа, трэніроўкі...

**- А ці цяжка вучыцца міс?**

- Цяжка. Шмат раз'ездаў. Потым даводзіцца начамі перапісваць канспекты, здаваць сесію адной, без групы. Але, на шчасце, вучоба ідзе добра, без «хвастоў».





**- Якія думкі наконт будучыні?**

- Галоўнае - закончыць вучобу. Усё ж такі матэматыка - гэта мая прафесія. А работа мадэлі - хобі.

**- Як у сям'і ставяцца да тваіх поспехаў?**

- Тата ганарыцца. Мама хвалюецца. Бацькі ездзяць разам са мной на конкурсы, перажываюць і радуюцца разам са мной. А сястрычка Аня - ёй 13 - стараецца быць падобнай на мадэль, пераймае хаду, жэсты. Я тры месяцы ўжо выкладаю ў школе ЮНІарт. Аня, як крыху яшчэ падрасце, прыйдзе ў гэтую школу вучыцца. Няхай паспрабуе...

**- Якое ўражанне пакінула апошняе выступленне ў Маскве?**

- Добрае. Усё было так арганізавана, прадумана. Пяць выхадаў - у нацыянальным касцюме, вячэрнім уборы, купальніку са спаднічкай, спартыўнай калекцыі, у лёгкім і ў шыкоўным плаццях. А потым быў банкет. І падарункі былі каштоўныя - відэадвойкі...

**- Што чакае «Віцэ-міс Садружнасць - 99» у бліжэйшай будучыні?**

- Ёсць запрашэнне да ўдзелу ў конкурсе «Міс Еўропа», які будзе праводзіцца 25 чэрвеня ў Ліване...

**- Поспеху, удачы!**

Інтэрв'ю вяла **Л. ДАНІЛАВА.**

праект

# ПАЛАЖЭННЕ

## аб матэрыяльным стымуляванні студэнтаў бюджэтнай формы навучання Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы

**1. Агульныя палажэнні**

1.1. Палажэнне аб матэрыяльным стымуляванні студэнтаў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы (далей Палажэнне) распрацавана ў мэтах заахвочвання студэнтаў універсітэта за выдатныя і добрыя поспехі ў навучанні, навукова-даследчай, культурна-масавай і грамадскай рабоце, дасягненні ў спорце.

1.2. Палажэнне распрацавана ў адпаведнасці з Законам «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь», Інструкцыяй аб парадку прызначэння і выплаты стыпендый студэнтам вышэйшых навучальных устаноў, Статутам універсітэта, пагадненнем паміж прафкамам студэнтаў і адміністрацыяй універсітэта.

1.3. Палажэнне распаўсюджваецца на студэнтаў дзённай бюджэтнай формы навучання. Матэрыяльнае заахвочванне студэнтаў пазабюджэтнай формы навучання ажыццяўляецца Палажэннем аб заахвочванні і льготах у аплаце за навучанне для студэнтаў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы, якія навучаюцца на дагаворных падставах.

1.4. Палажэнне зацвярджаецца рэктарам універсітэта пасля адабрэння яго пашыраным пасяджэннем прафкама студэнтаў.

Змяненні і дапаўненні ў дадзенае Палажэнне могуць быць унесены толькі пасля адабрэння іх пашыраным пасяджэннем студэнцкага прафкама.

**2. Парадак фарміравання і асноўныя напрамкі выкарыстання фонда матэрыяльнага стымулявання**

2.1. Фонд матэрыяльнага стымулявання фарміруецца з наступных крыніц:

- дзяржбюджэтных сродкаў (сродкаў эканоміі стыпендыяльнага фонду, сродкаў дадатковага фонду - 4% ад стыпендыяльнага);
- пазабюджэтных сродкаў (сродкаў, пералічаных спонсарамі).

2.2. Фонд матэрыяльнага стымулявання складаецца з фонду надбавак і прэміяльнага фонду ў розных суадносінах.

**3. Парадак і ўмовы ўстанаўлення надбавак**

3.1. Надбаўкі ў выглядзе штомесячных даплат да стыпендый устанаўліваюцца:

- старастам акадэмічных груп;
- старшыням і членам студэнцкіх саветаў інтэрнатаў;
- старшыням прафсаюзных бюро факультэтаў і аддзяленняў;
- членам студэнцкага аператыўнага атрада;
- членам прафкама студэнтаў універсітэта;
- членам камітэта БПСМ універсітэта;
- членам савета студэнцкага навуковага згуртавання універсітэта;
- членам савета студэнцкага клуба універсітэта.

3.2. Для ўстанаўлення надбавак вышэйназваным катэгорыям студэнтаў распрацоўваецца шкала надбавак (базавыя каэфіцыенты надбавак).

3.3. На падставе каэфіцыентаў вызначаюцца індывідуальныя каэфіцыенты і памеры надбавак.

3.4. Мінімальны базавы каэфіцыент надбавак - 0,1.

3.5. Максімальны базавы каэфіцыент надбавак - 0,3.

3.6. У залежнасці ад статуса і зместу абавязкаў устанаўліваюцца наступныя базавыя каэфіцыенты надбавак:

а) старастам акадэмічных груп, старшыням студэнцкіх саветаў інтэрнатаў, сакратару камітэта БПСМ універсітэта - 0,3;

б) членам прафкама студэнтаў універсітэта, старшыням прафсаюзных бюро факультэтаў і аддзяленняў - 0,25;

в) членам студэнцкіх саветаў інтэрнатаў - 0,2;

г) членам савета студэнцкага навуковага згуртавання, членам савета студэнцкага клуба універсітэта, членам камітэта БПСМ універсітэта, членам студэнцкага аператыўнага атрада - 0.1.

3.7. У выпадку, калі дзейнасць студэнта адпавядае некальким базавым каэфіцыентам надбавак, яго індывідуальны каэфіцыент надбаўкі вызначаецца як сума базавых, але не можа перавышаць 0,5.

3.8. Устанаўленне індывідуальных каэфіцыентаў надбавак ажыццяўляецца навучальным аддзелам па прадстаўленнях:

- дэканаў факультэтаў (для старастакадэмічных груп);
- начальніка аддзела выхаваўчай работы са студэнтамі (для старшынь і членаў студэнцкіх саветаў інтэрнатаў, сакратара і членаў камітэта БПСМ універсітэта, членаў студэнцкага аператыўнага атрада, членаў савета студэнцкага клуба універсітэта);
- начальніка НІСа (для членаў студэнцкага навуковага згуртавання універсітэта);
- старшыні прафкама студэнтаў( для членаў прафкама і старшынь прафбюро факультэтаў і аддзяленняў).

**4. Парадак прэміравання супрацоўнікаў універсітэта**

4.1. Прэміраванне з'яўляецца матэрыяльным заахвочваннем студэнтаў за дасягненні імі якасных вынікаў у навучанні, навукова-даследчай, спартыўнай, культурнай і грамадскай дзейнасці.

4.2. Прэміраванне студэнтаў можа праводзіцца:

- за выдатныя і добрыя адзнакі экзаменаў, курсавых работ, практык;
- за удзел у навуковых і практычных канферэнцыях з апублікаваннем матэрыялаў выступленняў;
- за выніковы ўдзел у творчых выставах, музыкальных і творчых фестывалях, конкурсах, спартыўных спаборніцтвах;
- за апублікаванне артыкула ў навуковым часопісе;
- за тэхнічныя вынаходніцтвы і стварэнне праграмных прадуктаў;
- за ўдзел у арганізацыі навуковых канферэнцый, спартыўных і культурна-масавых мерапрыемстваў універсітэцкага, рэгіянальнага, рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўню;
- за ўдарную працу ў студэнцкіх будаўнічых і педагагічных атрадах;
- за прысуджэнне званняў кандыдатаў у майстры спорту і вышэй.

4.3. Прэміяльны фонд атрымліваецца як рознасць паміж фондам матэрыяльнага стымулявання і фондам надбавак.

4.4. Прэміяльны фонд складаецца з прэміяльнага фонду факультэтаў (80%) і прэміяльнага фонду аддзела выхаваўчай работы са студэнтамі (20%).

4.5. Прэміяльны фонд факультэта выкарыстоўваецца па ўзгодненым рашэнні дэканата, прафсаюзнага бюро студэнтаў і старастата факультэта.

4.6. Прэміяльны фонд аддзела выхаваўчай работы выкарыстоўваецца па ўзгодненым рашэнні аддзела, прафкама студэнтаў і камітэта БПСМ універсітэта.

**Старшыня прафкама студэнтаў А. ГРЫНЬ.**

# Прафсаюзная канферэнцыя

Адбылася прафсаюзная канферэнцыя працоўнага калектыву універсітэта. На парадку дня былі наступныя пытанні: Аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў ад калектыву ГрДУ; Вынікі выканання калектыўнага дагавору ў 1998 годзе і ўнясенне дапаўненняў у калектыўны дагавор на 1999 год; Абмеркаванне праекта Палажэння аб матэрыяльным стымуляванні супрацоўнікаў універсітэта.

Па першым пытанні выступіў першы прарэктар універсітэта І.П. Мартынаў. Ён прапанаваў вылучыць кандыдатам у дэпутаты абласнога савета па трэцяй універсітэцкай выбарчай акрузе рэктара ГрДУ прафесара С.А. Маскевіча. У падтрымку гэтай кандыдатуры выступілі намеснік дэкана факультэта гісторыі і культуры М.У. Марцён, старшыня савета ветэранаў М.В. Васілючак, дэкан факультэта фізічнай культуры У.М. Карчэўскі, намеснік дэкана філалагічнага факультэта М.А. Данілевіч, бухгалтар М.І. Каралёва.

Затым са справаздачай аб выкананні калектыўнага дагавору ў 1998 годзе выступіў старшыня прафсаюзнага камітэта універсітэта У.А. Хілюта.

- Цяжка сёння гаварыць аб сацыяльнай абароне. Трэба зыходзіць з рэалій дня, з магчымасцяў універсітэта. Тым больш прыемна адзначыць, што мы своечасова выплочваем заработную плату, прэміі па бюджэту і з пазабюджэтных сродкаў. Вядома, ж, такі ўзровень заработнай платы не можа задавальняць, але адміністрацыя універсітэта разам з прафкамам робяць усё магчымае, каб дапамагчы членам калектыву матэрыяльна, - сказаў У.А. Хілюта. - Многае зроблена ў плане забеспячэння жыллём. У мінулым годзе атрыманы кватэры для 26 выкладчыкаў. Дзве кватэры будуць атрыманы вясной. Такім чынам чарга на атрыманне жылля скарачаецца.

Далей старшыня прафкама спыніўся на рабоце прафкама і адміністрацыі ў плане аздараўлення супрацоўнікаў і іх дзяцей. Ён таксама спыніўся на тым, што, як ніколі, дасягнута ўзаемадзеянне з адміністрацыяй у справе сацыяльнай абароны людзей.

З садакладам выступіў рэктар універсітэта С.А. Маскевіч. Ён закрануў у сваім выступленні праблемы сістэмы аплаты працы, спыніўся на будаўніцтве, па перамяшчэннях падраздзяленняў у сувязі з атрыманнем у карыстанне памяшканняў завода «Радыёпрыбор», расказаў аб стане будаўніцтва сталовай па вул. Даватара і студэнцкага інтэрната, дзе, дарэчы, закладзены і кватэры для выкладчыкаў.

Затым з невялікімі дапаўненнямі выступіў намеснік старшыні гарвыканкама Я.М. Жабрун.

Па трэцім пытанні парадку дня - Праекце палажэння аб матэрыяльным стымуляванні - выступіў першы прарэктар універсітэта І.П. Мартынаў. Ён зачытаў тыя дапаўненні, якія паступілі ў адміністрацыю. Паколькі тэкст праекта палажэння быў у прысутных на руках, і тэма гэтая хвалюе ўсіх, абмеркаванне палажэння было актыўным. Яно прынята з невялікімі папраўкамі.

# ХРАНИТЕЛЬНИЦЫ ТРАДИЦИЙ

~~Т. МАРКЕВИЧ~~ ПЛЯВГОЕ.

**студентка 2 курса филологического факультета**

Нам выпала прекрасная возможность побывать в д.Заболоть Вороновского района, чтобы поближе познакомиться с людьми, проживающими там, узнать их традиции, обряды, быт. Главной нашей целью было как можно глубже понять и прочувствовать то духовное наследие, те произведения народного творчества, ту атмосферу, в которой живут и трудятся местные жители.

За несколько дней практики мы успели полюбить природу этого края. Благодаря учительнице истории Заболоцкой Янине Николаевне, мы узнали много фактов из истории деревни. Нужно сознаться, что рассказ Янины Николаевны тронул нас до глубины души.

Несколько дней, проведенных в деревне, позволили нам наитеснейшим образом сблизиться с местными жителями. И отметим, что сближение это произошло именно через фольклорное наследие: песни, частушки, поговорки, пословицы, загадки. И это вполне понятно. Где, как не в песне, наиболее полно раскрывается душа народа. Порой хватает несколько строчек из песни, чтобы понять, прочувствовать, чем живет, о чем мечтает, на что надеется человек. Как приятно осознавать, что фольклор живёт! Он продолжает развиваться, передаваться из уст в уста, из поколения в поколение. Во время работы нам выпала возможность познакомиться с исполнителями фольклорных произведений. И хотя таких знакомств у нас было немного, однако впечатления, оставленные каждой такой встречей, просто захватывают своим лиризмом и романтизмом. Каждое знакомство с исполнителями оставило незабываемый след в душе каждого из нас.

Совсем случайно встретились с замечательным человеком Шафеевой Эмилией Константиновной. О себе Эмилия Константиновна рассказывала не очень охотно. Однако слезы, выступившие на глазах женщины при исполнении старинных песен о горькой доле замужней женщины, сказали куда больше. Это человек, принимающий чужую боль как свою. Судьба подарила нам еще одну замечательную встречу - с Региной Ивановной Будько. Женщина, обладающая звонким голосом, пела преимущественно жизнерадостные песни.

Только самые теплые слова можно сказать в адрес Марии Ивановны Кудель.

Совсем недолгой была встреча с Марией Александровной Стасевич.

Но самой плодотворной была встреча с великолепной певуньей Региной Адольфовной Русинович.

Несладкая жизнь у Регины Адольфовны. Но, несмотря на все сложности, женщина идет по жизни с песнями. Мы записали более 20 песен. Много пришлось перенести человеку, но она не утратила все же любовь к песне, чувство любви к своей родной земле: душа Регины Адольфовны в ее песнях.

Нельзя не рассказать о прекрасном человеке, учительнице белорусского языка Фаине Степановне Войшнис. Эта женщина уже 16 лет живет и работает в д. Заболоть. Хоть наша встреча длилась недолго, однако же с полной уверенностью могу заявить, что Фаина Степановна - настоящий патриот своей Родины. Она старается всеми способами внести радость в заполненную трудом жизнь односельчан. Она понимает, что необходимо поддерживать национальное наследие, возвращаться к своим корням. Это и побудило Фаину Степановну создать фольклорный кружок «Фольклорист».

В деревне Заболоть и в окрестных деревнях живет очень много талантливых людей. Мы познакомились с людьми с добрым сердцем. Все они - мастера-самоучки.

В деревне Ремзы живет исполнительница Альбертина Иосифовна Адамович. В Заболотском сельском совете активно действует хор. Певуньи выступают на местных праздниках, выезжают с концертами в другие деревни. Участники хора - замечательные, самоотверженные, открытые люди. Нередко в хоре - целые семьи. В репертуар кружка входят преимущественно песни, а также частушки, пословицы.

Проводятся в деревне и народные праздники: масленица, коляды, купалье, где не обходятся без народной песни, частушки. Во всём разнообразии жанров есть такие, которые в настоящее время активно бытуют и, напротив, те, записывание которых происходит по воспоминаниям. Наиболее популярна песня. Причину я вижу прежде всего в том, что именно в песне раскрывается душа народа, становятся понятными мысли, надежды людей.

Слушая песни, невольно входишь в душу исполнителя, понимаешь, сочувствуешь, радуешься вместе с поющими. И еще: песня характеризует самого человека. По песням, входящим в репертуар исполнителя, можно составить характеристику исполняющего песни.

Многие мастера народного творчества не только прекрасно поют, но и сами сочиняют песни: Юрий Антонович Кашлей написал песню о своей родной деревне. Жители д. Заболоть дорожат такими людьми. Простые деревенские люди с огромным удовольствием беседовали с нами, помогая понять народные традиции. Мы заметили, что, несмотря на сложности жизни, жители Заболоти не потеряли прекрасное чувство юмора. Мы отметили их живой народный язык. Невольно удивляешься: какие все же прекрасные у нас женщины: мастерицы, хранительницы, певуньи!

*Да 60-годдзя ГрДУ*

# ВАЖНАЯ ВЕХА Ў НАШАЙ ГІСТОРЫІ

**М. ВАСІЛЮЧАК,**
**былы прарэктар завочнага аддзялення**

З адкрыццём у 1978 годзе на базе педінстытута імя Янкі Купалы Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта адбыліся значныя якасныя перамены і на завочным аддзяленні. Вельмі важнай падзеяй было адкрыццё ў 1979 годзе на завочным аддзяленні спецыяльнасці "Правазнаўства". План набору быў зацверджаны Міністэрствам вышэйшай адукацыі Беларусі ў колькасці 50 чалавек. Напружана працаваў дэканат: трэба было распрацаваць праграмы па новых дысцыплінах, зацвердзіць планы, правесці арганізацыйную работу сярод моладзі па набору на 1 курс аддзялення правазнаўства. Заўважу, што дзённае аддзяленне па спецыяльнасці «Правазнаўства» было адкрыта ў 1978 годзе пры гістарычным факультэце.

Вялікую працу па адкрыццю новай спецыяльнасці правёў рэктарат універсітэта і выконваючы абавязкі дэкана правазнаўства (пазней дэкан) Іван Вітальевіч Гушчын. У хуткім часе метадыстам на завочным аддзяленні на факультэце была прызначана Вера Пятроўна Удавічэнка, якая і па сённяшні дзень кваліфікавана выконвае свае прафесійныя абавязкі, з'яўляецца душой і сэрцам калектыву.

Набор на першы курс спецыяльнасці «Правазнаўства» прайшоў паспяхова. Было залічана 50 студэнтаў-завочнікаў, якія працавалі, як правіла, па спецыяльнасці . Вось некаторыя студэнты-завочнікі першага набору - юбіляры ў гэтым годзе: Л.С. Заблоцкі, В.А. Кабяк, М.М. Баброўнік, С.В. Кот, М.М. Супрун, І.М. Майсееў, М.М. Жыдок, В.В. Кавальчук, А.Г. Мацкевіч, І.А. Шкута, Я.Г. Матліс, Э.А. Сечка, У.В. Янкоўскі, Я.С. Кокарава, Р.Б. Варано. Неабходна адзначыць, што названыя студэнтызавочнікі паспяхова закончылі універсітэт і займаюць адказныя пасады. Прыехалі на факультэт і першыя кваліфікаваныя выкладчыкі: І.В. Гушчын, Г.Т. Осіпава, І.М. Гарбачоў, Г.А. Зорын, С.І. Жураўскі, Г.Г. Шыханцоў, Ю.Г. Лутчанка. У хуткім часе папоўнілі шарэнгі кваліфікаваных выкладчыкаў Васіль Цімафеевіч Калмыкоў, Сцяпан Фёдаравіч Сокал - былыя дэканы, В.Ф. Ваньшын, М.У. Сільчанка і Іосіф Іванавіч Вялента, які з'яўляецца дэканам юрыдычнага факультэта.

За дваццаць гадоў на завочным аддзяленні адбыліся як колькасныя, так і якасныя змены. На мой погляд, няхай не пакрыўдзяцца на мяне, юрыдычны факультэт - вядучы факультэт Гродзенскага універсітэта. На 1 студзеня 1999 года завочнікаў-студэнтаў на факультэце налічваецца як на дзяржбюджэце, так і на платнай форме навучання 826.

Ужо адбылося 14 выпускаў. Для нашай дзяржавы падрыхтаваны 1216 высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія працуюць у органах міліцыі, ДАІ,КДБ, юстыцыі, у арміі, у дзяржаўных установах, пракуратуры, у адвакатуры, юрыстамі ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, камерцыі і г.д. Вось некаторыя нашы былыя студэнтызавочнікі з вышэйшай юрыдычнай адукацыяй: Г.Г. Антановіч, У.В. Аўтухоў, П.В. Барадаўка, У.У.Белы, А.І. Балыка, В.Ю.Бубенчык, А.С. Бурчык, У.К. Вайтушка, В.Я. Шанціла, Г.І.Кісель, І.У. Шмакаў, С.У. Жукоўская, Л.У. Чмель, У.П. Размысловіч, Г.І. Сысой, В.В. Сінюцін, С.В. Чапля, Г.М. Малышка, М.М. Крывец, А.М.Давыдзік, У.П. Зяленка, В.А. Карповіч, С.І. Трафімычык, У.А. Талочак, А.У. Дуднік, Л.І.Клунейка, М.М.Піута, І.І. Трусіла, М.П. Зялёны.

Хочацца заўважыць, што 1216 нашых выпускнікоў з вышэйшай юрыдычнай адукацыяй працуюць не толькі ў Рэспубліцы Беларусь, але і на неабсяжных прасторах былога Савецкага Саюза, і за мяжой. Яны праслаўляюць добрыя традыцыі і славу Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. Пажадаем дэкану юрыдычнага факультэта далейшых поспехаў у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў, якаснага росту выкладчыцкага корпуса.

# ТАЛЕНТЫ – ПОБАЧ

Каманда КВЗ універсітэта «Янкі» адразу ж, як толькі з'явілася на свет, заявіла аб сабе. Вось і на нядаўнім першым туры вышэйшай лігі Рэспублікі Беларусь, які праходзіў у лютым у Гродне, «Янкі» выступілі добра.

Госці рэдакцыі - капітан каманды КВЗ Юрый Сегіневіч і яе адміністратар Ігар Кергет.

**- З чаго ўсё пачыналася?**

- **Ю.С.**- Крыху больш як год таму ў Магілёве праходзіў фестываль БПСМ, дзе сустрэліся каманды КВЗ з усёй рэспублікі. А ў Гродне такой каманды не было. І яна з'явілася. Стварылі і калектыў, і праграму за два тыдні. Выступілі і... самі не паверылі. Выйшлі ў першую лігу. Прывезлі граматы.

**- Гэта, вядома, акрыліла калектыў. Але бывае так, што запалу хапае не надоўга...**

- **І.К.** - Думаем, гэты поспех не быў выпадковым. Бо зноў жа ўдзельнічалі ў ІІ і ІІІ Беларускіх фестывалях каманд КВЗ у Мінску. У выніку выйшлі ў вышэйшую лігу.

**- Як нарадзілася назва каманды? Хто ўвайшоў у яе склад?**

- **Ю.С.** - Па-першае, універсітэт носіць імя Янкі Купалы. Па-другое - Янка - гэта вобраз беларускага юнака, такога праставатага, але і хітрага, з пачуццём гумару. У складзе каманды - студэнты фізіка-тэхнічнага, біялагічнага, матэматычнага, філалагічнага, юрыдычнага факультэтаў, аддзялення мастацтваў факультэта педагогікі і псіхалогіі. Секцыя КВЗ дзейнічае на базе ФГП.

**- Хто складае праграму, ажыццяўляе цэнзуру?**

- **Ю.С.** - Самі члены каманды. Кожны падкіне нейкі жарт, рэпліку, потым разам абмяркоўваем, выбіраем лепшае. А цэнзура - мы. Імкнемся, каб усё было прыстойна, каб не паўтарацца, каб не было старых, з барадой, анекдотаў.

**- Якія планы ў каманды?**

- **І.К.** - Удзел у рэспубліканскіх фестывалях вышэйшай лігі - сам па сабе добры вынік. Хацелася б, каб каманду ведалі ў рэспубліцы. Добра, што ва універсітэце нас сталі запрашаць на вечарыны, прызналі. Але трэба шліфаваць майстэрства, быць своеасаблівымі, не падобнымі на іншых. Дзякуй кіраўніцтву універсітэта - не адмаўляюць нам у фінансах для паездак на фестывалі. Будуць і касцюмы для ўдзельнікаў каманды. У наш нялёгкі час вельмі важна адчуваць, што культура, самадзейная творчасць - не на апошнім месцы. Будзем старацца, каб апраўдаць надзеі. Наперадзе - конкурсы, выступленні. Прыходзьце, не пашкадуеце...

**Наш кар.**

## Сектар пл[illegible]га адукацыі паведамляе

24 снежня 1998 года Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прыняў Пастанову N 1972, у якой устанавіў з 1 студзеня 1999 года новы памер тарыфнай стаўкі першага разраду - 1.200.000 рублёў. Каб кампенсаваць паўлялічыўшыяся выдаткі універсітэта, звязаныя з навучаннем студэнтаў на дагаворнай падставе, кіруючыся Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь N 453 ад 05.11.96 года рэктарам выданы загад N 15 ад 13.01.99 года, у якім прадугледжаны адпаведныя даплаты. У залежнасці ад спецыяльнасці, курса, формы навучання, а таксама ўмоў залічэння ва універсітэт памер даплат складае ад 8.500.000 да 34.000.000 рублёў. Усе студэнты, якія навучаюцца на дагаворнай падставе ў тэрмін да 05.02.99 года павінны атрымаць інфармацыйныя пісьмы, у якіх разлічаны індывідуальны памер кошту навучання. Аплата кошту навучання павінна быць унесена на разліковы рахунак універсітэта ў тэрмін да 1 сакавіка 1999 года.

У выпадку парушэння фінансавай дысцыпліны студэнты адлічваюцца з універсітэта, а іх аднаўленне звязана з арганізацыйнымі і фінансавымі цяжкасцямі. Так, у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, хлопцы, адлічаныя з вну, падлягаюць прызыву ва Узброеныя Сілы Беларусі, а за афармленне неабходных дакументаў пры аднаўленні трэба заплаціць 6 мінімальных заробкаў.

Нягледзячы на павышэнне кошту навучання, памер аплаты ва універсітэце адзін з самых нізкіх як у горадзе Гродна, так і ў Беларусі ў цэлым. На 1 студзеня 1999 года ў доларавым эквіваленце (рынкавы курс) сярэдні памер аплаты за год навучання ў нашым універсітэце склаў усяго толькі 200 долараў ЗША, для параўнання: ў 1996 годзе памер аплаты быў каля 300$. У недзяржаўных вну горада Гродна кошт навучання складае каля 600$, у той самы час, як у Мінску кошт навучання часта дасягае нават 1500$ за год.

**А. БЕЛАВУСАЎ,**
**нам.начальніка СПА.**

# "НАДНЁМАНСКІЯ ГАЛАСЫ": НОВЫЯ ІМЁНЫ

**Думаю, многія пагодзяцца з тым, што кожнае свята ў душы чалавека выклікае адметны настрой, стварае, так мовіць, своеасаблівую святочную атмасферу. Адно - урачыстую, прыўзнятую, другое - лірычную, задуменную, а трэцяе - рамантычна-загадкавую, таямнічую.**

**Я мяркую, гэта залежыць ад таго, што мы з самага маленства верым ў абавязковае здзяйсненне ўсіх пажаданняў.**

**Вядома ж, у кожнага яны свае... Але часам здараецца так, што асабліва шчырыя, запаветныя словы, якія выказаў некалі адзін чалавек, становяцца надзвычай вядомымі і дарагімі для ўсіх. Іх чытаюць, над імі задумваюцца, завяшчаюць і дораць сваім самым блізкім людзям.**

**У такім выпадку хочацца ўспомніць славутага англійскага пісьменніка Дж. Р. Кіплінга, які пакінуў сваім нашчадкам словы добрага і мудрага запавету. Велічна і ўрачыста гучаць яго радкі:**

**Наполни смыслом каждое мгновенье,**<br>
**Часов и дней неумолимый бег, -**<br>
**Тогда весь мир ты примешь во владенье,**<br>
**Тогда, мой сын, ты будешь человек!**

**Як бачым, ведаюць яго ў многіх краінах свету, перакладзены ён і на беларускую мову, але пра гэты пераклад, на жаль, ведаюць мала. Адшукаць яго ў сённяшніх шматлікіх выданнях няпроста. І таму нашы студэнты вырашылі зрабіць усім нам такі вось адметны падарунак. Яны прапануюць чытачам свае варыянты перакладу на беларускую мову гэтага знакамітага верша.**

**Бяспрэчна, кожны пераклад своеасабліва адметны, цікавы нейкім трапна выяўленым словам, паваротам думак. Але ж ёсць і агульнае: шчыра далучыцца да самых найлепшых пажаданняў усім нам і імкненне ўбачыць кожнага з нас духоўна прыгожым і высакародным.**

**Святлана ТАРАСАВА,**<br>
**старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры, кіраўнік літаб'яднання**

**Наталля АДАМОВІЧ**

Калі ты можаш захаваць спакой,<br>
Калі навокал галовы губляюць,<br>
Калі ніхто не задаволены табой<br>
І на цябе несправядліва наракаюць,<br>
Калі ты можаш давяраць сабе,<br>
А на цябе з сумненнем пазіраюць<br>
І гэта ставяць у віну табе<br>
І падазрона позіркі кідаюць,<br>
Калі ты можаш усё жыццё чакаць,<br>
Не стомлены за гэты час чаканнем,<br>
Калі ты можаш марыць, у снах лятаць<br>
І не шукаць у марах апраўдання,<br>
Калі стаўляюць сеткі плеткары,<br>
Глядзі: не стань падобным пустамеляй,<br>
Калі праклёны шлюць нядаўнія сябры,<br>
Не апускайся перад імі на калені.<br>
Калі ты можаш думаць, меркаваць,<br>
Але не жыць адною думкаю штодзённа,<br>
Калі бяду і радасць сустракаць<br>
Аднолькава ты можаш пранікнёна,<br>
Калі ты можаш праўду распазнаць<br>
Сярод ілжы шматлікіх пераплётаў,<br>
Калі з абломкаў замак будаваць<br>
Ты можаш, а ўсё, чым ты валодаў,<br>
На кон паставіць смела і губляць,<br>
Згубіць і пачынаць з нуля будову,<br>
Калі сябе прымусіць можаш працаваць<br>
І пачынаць жыццё нанова,<br>
Калі змяшаешся з натоўпам беднаты<br>
І будзеш вылучацца з іх душы багаццем,<br>
Калі ў размове з каралямі ты на «ты»,<br>
І можаш з імі розумам раўняцца,<br>
Калі ні ворагі, ні лепшыя сябры<br>
Не могуць падтрымаць цябе ў адчаі,<br>
Калі не лічацца з табой гаспадары,<br>
Не адступай назад, не спачувай ім.<br>
Напоўні дзень свой рухам, дабрынёй,<br>
І паглядзі ў неба, павярніся к сонцу,<br>
Тады, мой сын, Зямля будзе тваёй,<br>
І шчасце будзе для цябе бясконцым.

× × ×

**Таццяна ГРЫШУК**

Калі ты сам з сабою ў згодзе,<br>
А ўсё навокал супраціў цябе,<br>
Калі ты верыш, а ў народзе<br>
Няма той веры нават да сябе,<br>
Калі чакаеш ты без хвалявання,<br>
Калі хлусня цябе не праглыне,<br>
Не наракаеш, не даеш прызнання,<br>
Што ты святы і час твой настае.<br>
Калі ж гарачую заўзятасць<br>
Трымаеш моцна ў сваіх руках,<br>
Ты цвёрды, мужны, прыўзняты,<br>
Каб поспехі і гора сустракаць.<br>
Калі ўпэўненасць твая і твае словы<br>
Спатрэбяцца для новых добрых спраў.<br>
Калі ты здольны, а пасля нанова<br>
Стаць тым, якім ужо ты стаў.<br>
Калі ты здольны ўсё сваё, што маеш<br>
Аддаць, згубіць альбо прайграць,<br>
Не шкадаваць таго, што атрымаеш,<br>
А жыць далей і лепшага жадаць.<br>
Калі ты здольны сваім сэрцам<br>
Наперад клікаць, смелым, моцным быць,<br>
Не ашчаджаць сябе і ў бітве грэцца,<br>
І голас чуць: "Трымайся! Трэба жыць!"<br>
Калі ты здольны быць самім сабою<br>
Сярод натоўпу і паміж гаспод<br>
І слухаць тых, хто не з табою,<br>
І паважаць любы народ.<br>
Калі жыцця адлегласць змерыць<br>
Хвілінамі ты можаш з веку ў век,<br>
Зямля - твой кут і вымярэнне,<br>
І, больш таго, ты - чалавек!

× × ×

**Наталля ФЯДЗЮК**

Калі ты можаш у спакоі заставацца<br>
Тады, як іншыя губляюць галаву.<br>
І раптам пачынаюць сумнявацца,<br>
Ты ж веру не губляй сваю.<br>
Калі ты можаш не стамляцца ў чаканні,<br>
Хоць быць падмантутым, ды не тануць у хлусні,<br>
І, не зважаючы на выпрабаванні,<br>
Не паддавацца неразумнай мітусні.<br>
Калі над марай можаш гаспадарыць<br>
І можаш жыць бяздумна, безразважна,<br>
Калі падзенне і трыумф жыццё падарыць,<br>
Аднолькава абходзь іх - гэта важна.<br>
Сцярпі і выслухай любое слова,<br>
Скажонае ліхімі махлярамі,<br>
Хоць можа быць разбуранай аснова,<br>
Зноў аднаві яе і справай, і славамі.<br>
Калі захоплен светам перамог<br>
І верыш ў лёс, і ў сваю ўдачу,<br>
Не бойся страціць тое, што зберог,<br>
На страты пагалядзі інача й.<br>
Калі прымусіць можаш сваё сэрца<br>
І нервы паслужыць табе аддана,<br>
Калі душа не згасне ў паняверцы,<br>
Трымацца і не здацца пажадана.<br>
Калі ты можаш з каралямі пабратацца,<br>
Калі ўсе людзі лічацца з табой,<br>
І з простым калі зможаш параўняцца,<br>
Ты будзеш чалавекам, сыне мой!

*Советы пс[illegible]га*

# ТЕСТ на оценку самоконтроля в общении

Внимательно прочтите десять предложений, описывающих реакции на некоторые ситуации. Каждое из них вы должны оценить как верное или неверное применительно к самому себе. Если предложение кажется вам верным или преимущественно верным, поставьте рядом с порядковым номером букву **«В»**, если неверным - букву **«Н»**.

1. Мне кажется трудным искусство подражать привычкам других людей
2. Я бы, пожалуй, мог свалять дурака, чтобы привлечь внимание или позабавить окружающих.
3. Из меня мог бы выйти неплохой актер.
4. Другим людям иногда кажется, что я переживаю что-то более глубоко, чем это есть на самом деле.
5. В компании я редко оказываюсь в центре внимания.
6. В разных ситуациях и в общении с разными людьми я часто веду себя совершенно по-разному.
7. Я могу отстаивать только то, в чем я искренне убежден.
8. Чтобы преуспеть в делах и в отношениях с людьми, я стараюсь быть таким, каким меня ожидают видеть.
9. Я могу быть дружелюбным с людьми, которых я не выношу.
10. Я не всегда такой, каким кажусь.

**Подсчет результатов:** по одному баллу начисляется за ответ **«Н»** на 1,5 и 7 вопросы и за ответ **«В»** на все остальные. Подсчитайте сумму баллов. Если Вы искренне отвечали на вопросы, то о Вас, по-видимому, можно сказать следующее:

**0-3 балла** - у Вас низкий коммуникативный контроль. Ваше поведение устойчиво, и Вы не считаете нужным изменяться в зависимости от ситуаций. Вы способны к искреннему самораскрытию в общении. Некоторые считают Вас «неудобным» в общении по причине вашей прямолинейности.

**4-6 баллов** - у Вас средний коммуникативный контроль, Вы искренни, но не сдержанны в своих эмоциональных проявлениях, считаетесь в своем поведении с окружающими людьми.

**7-10 баллов** - у Вас высокий коммуникативный контроль. Вы легко входите в любую роль, гибко реагируете на изменение ситуации, хорошо чувствуете и даже в состоянии предвидеть впечатление, которое Вы производите на окружающих.

**Подготовил П. КОВАЛЕВСКИЙ.**

# *Астропрогноз на март*

**ОВНЫ.** Ваши долгие ожидания увенчаются, наконец, победой. Вы получите то, что хотите. Не расслабляйтесь. Весь месяц придется напряженно трудиться. От этого зависит будущее. Неблагоприятные дни - 15, 23 и 28 марта.

**ТЕЛЬЦЫ.** Начало месяца будет спокойным. К середине звезды предрекают конфликтные ситуации, сплетни. И вы можете оказаться в их эпицентре. Будьте осторожнее в общении с начальством. Ваш неверный шаг - и обеспечена «холодная война» на долгое время. Наиболее благоприятным в финансовом отношении обещает быть конец месяца.

**БЛИЗНЕЦЫ.** Первое, что могут отчетливо ощутить некоторые Близнецы, это - весенний авитаминоз. Как более уязвимому знаку, астрологи рекомендуют Близнецам душевный покой, хорошее питание и... приятное общение. Эти факторы помогут преодолеть и болезненное состояние, и возможные нападки со стороны начальства или старших по возрасту. Хорошими должны быть дни 5, 9 и 19 марта.

**РАКИ.** В марте Раку захочется попятиться назад, в зимнюю спячку, так как навалится масса весенних дел и забот, о которых задумчивый Рак стал забывать. Но проблемы будут решаться на удивление легко. Месяц благоприятен в финансовом отношении. В то время, как представители других знаков будут считать последние гроши, у Рака всегда будет водиться звонкая монета. Таково положение небесных светил!

**ЛЬВЫ.** Прекрасный месяц для любви и заключения брака. Для тех, кто уже состоит в браке - достижение гармонии семейных отношений. Месяц благоприятен также для творческой и деловой активности. Но Львам не хватает корректности. Это обстоятельство может отрицательно повлиять на взаимоотношения с деловыми партнерами, коллегами.

**ДЕВЫ.** Достаточно благоприятный месяц. Появится прекрасная возможность для самореализации в профессиональной сфере. Однако чрезмерные эмоциональные перегрузки чреваты нервным срывом. Удача на стороне художников, людей других творческих профессий и путешественников.

**ВЕСЫ.** Неприятности на службе сменятся неожиданным успехом. Все будет получаться легко и просто. Но финансовая сторона жизни Весов плачевна. Лишь в конце второй декады положение изменится к лучшему и уже станет стабильно прочным. Благоприятное время для налаживания любых отношений.

**СКОРПИОНЫ.** Неожиданные повороты судьбы. Не исключены крупные финансовые потери. Надежной опорой станут близкие люди, родители. Потребуется максимум терпения и упорства, чтобы справиться с трудностями, но Вы их одолеете. Будут и светлые дни, и в марте их больше, чем плохих. Важно только уметь радоваться жизни.

**СТРЕЛЬЦЫ.** Многие Стрельцы привыкли довольствоваться малым. Это поможет им держаться на плаву. Месяц будет трудным в материальном плане. Возможны конфликты между близкими людьми.

**КОЗЕРОГИ.** Причиной неприятностей может стать чрезмерная болтливость и откровенность Козерогов. Вдобавок к этому возможны просчеты и убытки. Отрада - общение с природой, прогулки в парке, которые дадут энергетический заряд. Это и поможет справиться с трудностями.

**ВОДОЛЕЙ.** Ваши усилия в этом месяце можно назвать тщетными. Вы будете топтаться на одном месте, потому что так расположились небесные светила. Лучше сделать передышку в делах, успокоиться, навести порядок в доме, отдохнуть. Отдых как раз-таки наиболее результативен: вы просто устали.

**РЫБЫ.** Двойственность положения во всем: в отношениях, на службе, в финансах. Определитесь. Не сетуйте на судьбу - она благоволит Вам в марте. Будут приятные и полезные контакты. Не исключены путешествия. Правда, денег от этого у Рыб не прибавится...

*Рэдактар* **Людміла Мікалаеўна ДАНІЛАВА**

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Газета набрана, звярстана і надрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. ЛП № 111 ад 29.12.97 г.
Вул. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна.

*Набор і вёрстка:* **М. ВЕРСТАК, В. ЗАКРЭЎСКІ**
*Карэктура:* **Н. ДУДКО**

*Здадзена ў набор 05.02.99.*
*Падпісана да друку: 24.02.99. 15.00*
*Заказ № 10*

Аб'ём - 1 ум. друк. арк.
Наклад 500 асобнікаў.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас:* ✆ *230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 228.* ☎ *72-08-17.*